# СЛОВА

## Значэнне слова

**143.** Назавіце адным словам.

| | |
|---|---|
| Асобнае памяшканне з плітой для гатавання ежы. | *спальня* |
| Пакой, у якім спяць. | *ложак* |
| Будынак для жылля. | *кухня* |
| Мэбля, прызначаная для таго, каб на ёй спаць. | *дом* |

**Завяжы вузялок!**

Людзі карыстаюцца словамі для называння прадметаў, з'яў навакольнага свету, дзеянняў, якасцей. Кожнае слова мае пэўнае значэнне.

**Успомніце**

У якім парадку размяшчаюцца словы ў слоўніках?



Правообладатель Национальный институт образования

**Завяжы вузялок!**

У **руска-беларускім** слоўніку побач з рускім словам даецца яго пераклад на беларускую мову. Напрыклад: ***ко́мната*** — *пако́й*. У **беларуска-рускім** слоўніку побач з беларускім словам даецца яго пераклад на рускую мову. Напрыклад: ***падло́га*** — *пол*.

**144.** Пры дапамозе слоўніка перакладзіце словы *ковёр, диван, дверь, зеркало* на беларускую мову. Значэнне якіх слоў раскрываецца ніжэй?

Выраб з варсістай тканіны, які кладзецца на падлогу.

Мяккая мэбля са спінкай і падлакотнікамі.

Праём у сцяне для ўваходу і выхаду.

Гладкая бліскучая паверхня, здольная даваць адбіткі тых прадметаў, якія знаходзяцца перад ёй.

***дзве́ры***

Запішыце слова *дзверы* разам з яго значэннем. Што яшчэ называюць дзвярамі?

Дзверы — … .



Правообладатель Национальный институт образования

**145.** Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце слова-адгадку.



Хто ні ідзе, я прыпыня́ю,
падаваць руку змуша́ю,
маю вочка і званок,
маю моцны я замок.
Толькі ва́ртаму даве́ру
гаспадар адчыніць … .

*А. Церашкова.*



***ва́рты даве́ру*** *— той, каму можна давяраць*

**146.** Адгадайце загадку. Перакладзіце слова *прысады* на рускую мову.



**Д**омік летні ля прысад,
**а**гарод і спеўны сад
**ч**аста вельмі клічуць нас
**а**дпачыць у вольны час.

*У. Мазго.*

Спішыце загадку. У словах другога радка падкрэсліце літары, напісанне якіх трэба праверыць. Вусна падбярыце праверачныя словы.



Правообладатель Национальный институт образования

**147.** Прачытайце. Чым адрозніваюцца словы? Ці аднолькава яны пішуцца?

за́мкі — замкі́

Вусна дапоўніце сказы.

Палацы, у якіх жывуць каралеўскія асобы, — гэта ... .

Прыстасаванні для таго, каб зачыняць што-небудзь ключом, — гэта ... .

**Рм** Прывядзіце прыклады слоў, якія супадаюць у напісанні, але адрозніваюцца націскам у вымаўленні.



**148.** Прачытайце і адгадайце загадку. Звярніце ўвагу на выдзеленыя літары.



**Я** з металу **рукі** маю,
**к**арабель за нос трымаю.
**А** апусцяць — тры **рукі**
**р**азгарну на дне ракі.

*У. Мацвеенка.*

Спішыце загадку. Чым адрозніваюцца выдзеленыя словы?



Правообладатель Национальный институт образования